База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# Старонка ў летапіс подзвігу

Роўна 45 гадоў прайшло з часу абарокы Гомеля. І з кожным годам раскрываюцца перад намі ўсё новыя старонкі летапісу подзвігу абаронцаў горада. Час высвечвае невядомыя яшчэ імёны і падрабязнаеш.

Пра аднаго з герояў тых дзен, Імя якога стала нам еядсма нядаўна — гэты расказ.

У артыкуяе былога начальника Гомельскага гарнізона генерая-маёра І.Н. Беразоўскага «Страты немцаў над Гомелем», надрукаваным у газеце «Красная Звезда» за 27 жніўня 1941 года, гаварылася:

«14 жніўня немцы кінулі ў наступление ўсе свае сілы. Шэсць сутак запар ні ўдзень, ні ўначы не аслабявалі ўлартыя баі. Асабліва жорсткі характер наеілі яны ў раёне сяленняў Сямёнаўка і Пакалюбічы. Часці тт. Варонінз. Маневіча і Джахуа, узмоцненыя гомельскім народным апалчэннем, гераічна адстойзалі кожны метр савецкай зямлі. Тав. Варонін камандаваў артылерыйскай процітанкавай часцю. У цесным узаемадзеянні з пехацінцамі тав. Маневіча ён чацвёра сутак адбіваў адчайныя атакі цэлай нямецкай дывізіі на Сямёнаўку. Звыш 4000 фашысцкіх салдат і афіцэраў знэйшлі сабе магілу ў балотах і лясах еакоя Сямёнаўкі. З рук у рукі пераходзілі Пакалюбічы. Часць тав. Джэхуа тры разы контратакам! адбівала гэты пасёлак у немцаў і наносіла фашысцкім батальёнам цяжкія страты».

Пра герояў абароны Гомеля А. В. Вароніна і А. В. Маневіча супрацоўнікі нашага музея сабралі матэрыял яшчэ раней.

А вось пра Джахуа даведацца кіяк не ў давал ас я. Цяжкасці пошуку ўскладняліся тым, што не былі вядомы імя і імя ла бацьку



гэтага чалавека, нумар часці, якой ён камандаеаў. Прозвішча ў артыкуле, як высветлілася, указана не зусім дакладна.

Праглядаючы нядаўна кнігу «Вызваленне гэрадоў», я ўбачыў прозвішча Джахуа Кірылы Качоезіча — камандзіра 120-й стралковай дывізіі, якая вызначылася ў баях за Сталінгрэд. Падумалася: ці не той тэта Джахуа, які абараняў наш горад?

І вось перада мной аб’ём;-стая асабістая справа генерал-меёра Джахуа К. К., якая ластупіла з Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны СССР. У ей аўтабіяграфія, атэстацыі, узнагародныя лісты, службовыя і баявыя характарыстыкі, в ыпіскі з загадаў, фатаграфіі. Адшукалі мы і родзічаў Джахуа. Самога генерала, на жаль, у жывых ужо няма.

Ціказзя і багатая біяграфія гзтага чалавека. Кірыла Качоевіч Джахуа нарадзіўся ў сакавіку 1902 года ў сяле Джолева Грузінскай ССР у сялянскай сям’і. Вучыўся ў сёльскай школе, рамесным вучылішчы. Працаваў на заводзе токарам. У 1924 годзе быў прызваны

ў Чыраоную Армію. Закончыў Грузінскую аб'ядканую ваенную школу. Камандаваў узводам, ротай. За поспехі ў баявой і паяітычкай падрыхтоўцы падраздзялення ў 1936 годзе быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

З 1937 па 1939 год вучыўся ў Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе. Камандзірам батзльёна ўдзельнічаў у ванне з белафінамі і атрьгмаў сваю другую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга. Ваявога, тэарэтычна падрыхтаванага афіцэра назначаюць камандзірам палка, які дыслацыраваўся паблі-зу Брэста. У першы ж дзень вайны ён уступіў у бой.

«У кенцы ліпемя 1941 года, — піша ў сваей аўтабіяграфіі К. К. Джахуа, —"я з застаўшы-міся ў жыаых пасля прарыву з акружэння людзьмі прыбыў у г. Гомель і тут быў назначены камандзірам фарміруемага 636-га стралковага палка 160-й стралковай дывізіі. З 13 па 20 жніўня полк змагаўся за г. Гомель у саставе 67-га стралковага корпуса. 22 жніўкя 1941 года ў вулічных баях у Нава-беліцы я быў цяжка паранены і звакуіраваны праз Чарні-гаў у Сумы».

Неўзабаве Джахуа назначаецца камандзірам дывізіі. Ваяваў на Сталінградскім, Данскім, Стэпавым, 2-м і 3-м Украінскіх франтах. У сакавіку 1943 года яму было прысвоена званне генерал-маёра.

За умелее камандаванне палком і дывізіяй у гады 8я-лікай Айчыннай вайны, асабістую храбрасць і мужнасць К. К. Джахуа узнагародманы двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Кутузава II ступені, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, двума амерыканскімі ордэнамі і многімі медалямі.